ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (749) ✦ Пятніца, 6 чэрвеня 1969 г. Цана 2 кап. Год выдання XXII

На экзаменацыйным ЭКРАНЕ

ВЫНІК ВЯЛІКАЙ ПРАЦЫ

Цяпер амаль кожны дзень ва універсітэце адзначан знамянальнымі падзеямі. Значнымі і для студэнтаў, і для выкладчыкаў, і для спаборнікаў вучоных ступеней. Завяршаецца напружаны і плённы вучэбны год.

І як спадарожнікі поспеху, у кожнай аўдыторыі кветкі: цюльпаны і бэз, піёны і ружы. Іх дораць дысертантам, дыпломнікам, выкладчыкам.

Трэцяга чэрвеня першы дзяржаўны экзамен — палітэканомію—здавалі выпускнікі юрыдычнага аддзялення завочнага факультэта. Як толькі была выстаўлена апошняя адзнака, мы папрасілі экзаменатара Паўла Пятровіча Борсука расказаць аб тым, якую ацэнку дала ведам студэнтаў дзяржаўная камісія.

— У гэтай групе,— гаворыць П. П. Борсук,— з 22 чалавек выдатныя адзнакі атрымалі дзвое. Вельмі добра зарэкамендаваў сябе на працягу ўсяго перыяду навучання А. К. Іваненка, работнік органаў суда. Ён і дыпломную работу абараніў на выдатна, сур'ёзна рыхтаваўся да экзамена і выдатна адказаў на ўсе пытанні.

Не выклікала пярэчання ў членаў камісіі выдатная адзнака Н. А. Агаркову. Яго адказы на пытанні экзаменацыйнага білета і на дадатковыя сведчаць аб глыбокім і трывалым веданні важнейшых катэгорый палітэканоміі капіталізму і сацыялізма. Веды гэтыя ён умела прымяняе пры аналізе бягучых падзей у эканоміцы і палітыцы як капіталістычных, так і сацыялістычных краін.

Добрыя адзнакі атрымалі былы трактарыст, цяпер юрысконсульт В. К. Буза, юрысконсульт з Брэсцкай вобласці В. Г. Воранаў, ваеннаслужачыя М. П. Ляшко, С. Я. Батурын і іншыя выпускнікі, усяго 13 чалавек. Адказы шасцярых адзначаны здавальняюча і аднаго — нездавальняюча.

— Некаторыя выпускнікі,— працягвае П. П. Борсук,— недастаткова цвёрда ведаюць асобныя катэгорыі палітэканоміі, не ўмеюць звязаць тэарэтычныя палажэнні з практыкай гаспадаркі. Не ўсе сочаць за цякучымі газетнымі і часопіснымі матэрыяламі.

Дзяржэкзамен па палітэканоміі, упершыню уведзены ў гэтым годзе для студэнтаў-юрыстаў, будзе садзейнічаць лепшай эканамічнай падрыхтоўцы спецыялістаў, многім з якіх давядзецца працаваць юрысконсультамі на вытворчасці.

На кафедры палітэканоміі мы пагутарылі яшчэ з адным экзаменатарам — У. І. Максіным. Ён з вялікай пахвалой адклікнуўся аб трэцякурсніках-геолагах. Яны актыўна працавалі на працягу года на семінарах і паспяхова здалі экзамен.

СТАРТ ФІЗІКАЎ

31 мая закончыліся ўсе заняткі на фізічным факультэце. Другі семестр прайшоў больш паспяхова, чым першы. Не было зрываў заняткаў, не было такой перагрузкі вучэбнымі заняткамі, як у першым семестры.

Вучэбны план другога семестра выканан поўнасцю. Не было выпадкаў няякаснага правядзення заняткаў. Дастаткова здавальняючым было наведванне, хоць патрэбна адзначыць, што многія студэнты адрываліся на розныя спартыўныя спаборніцтвы.

І чэрвеня закончылася заліковая сесія. У цэлым яна прайшла нядрэнна. Усе студэнты своечасова разлічыліся з практычнымі заданнямі і лабараторнымі работамі і здалі ўсе залікі за выключэннем замежнай мовы. Па замежнай мове значны працэнт студэнтаў пройдзены матэрыял засвоіў нездавальняюча.

На трэцім курсе радыёфізікаў і на чацвёртым курсе студэнты закончылі абарону курсавых работ і здалі па аднаму два экзамены па грамадскіх і спецыяльных прадметах.

Першыя экзамены па замежнай мове, палітычнай эканоміі, педагогіцы, фізіцы космасу і спецыяльных дысцыплінах паказалі, што студэнты трэціх — чацвёртых курсаў да экзаменацыйнай сесіі падрыхтаваліся грунтоўна і пройдзены матэрыял засвоілі дастаткова добра. Па гэтых прадметах студэнты не атрымалі ні адной нездавальняючай адзнакі. Пераважная большасць студэнтаў паказала добрыя і выдатныя веды. З 29 груп, абараніўшых курсавыя работы, больш 90% студэнтаў атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі, больш паловы — толькі выдатныя.

Мы спадзяемся, што летняя экзаменацыйная сесія пройдзе больш паспяхова, чым зімовая, хоць для студэнтаў трэцяга і чацвёртага курсаў яна даволі напружаная. У сціслыя тэрміны даводзіцца здаваць па 6—7 залікаў і 4—6 экзаменаў.

Як і ў папярэднія экзаменацыйныя сесіі, у авангардзе ідуць студэнты Макараў, Мінько, Барздоў, Скрыпко, Базан, Бабеня і многія іншыя. І, як ні дзіўна, у хвасце цягнуцца тыя, якія ўзялі дрэнны старт з першага семестра і да гэтай пары не могуць ісці ў ногу з усімі.

Пажадаем студэнтам паспяховай здачы экзаменаў. Гэта будзе лепшым падарункам да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Я. ПІСКУНОЎ.

ШПАРГАЛКІ НЕ ДАПАМАГЛІ

Студэнты трэцяга курса філалагічнага факультэта здалі экзамен па курсу «Асновы навуковага атэізму». У цэлым вынікі добрыя. Большасць студэнтаў атрымала выдатныя і добрыя адзнакі. Тут сказалася не толькі жаданне атрымаць высокі бал, але і ўпорная праца, і патрабаванні экзаменатара. Студэнты добра разумелі, што без цвёрдага ведання матэрыялу па гэтаму курсу і вывучэння першакрыніц добрай адзнакі атрымаць нельга. Такімі былі патрабаванні. Аднак некаторая, хоць і зусім нязначная, частка студэнтаў замест вывучэння курса ўзялася за прыгатаванне шпаргалак. У выніку гэтыя студэнты атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Сярод іх неабходна назваць студэнтаў Крывіцкага (II група рускага аддзялення), Хвалея (III група беларускага аддзялення), Калачынскую (IV група беларускага аддзялення), якія яшчэ раз пераканаліся, што для паспяховай здачы экзамена патрэбны веды, а не шпаргалкі.

А. КАРПОВІЧ.

Да 25-годдзя вызвалення Беларусі

КНІГІ РАСКАЗВАЮЦЬ

У бібліятэцы БДУ арганізавана вялікая кніжная выстаўка «Гэтых дзён не змоўкне слава», прысвечаная 25-годдзю вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў.

Разам з публіцыстыкай на выстаўцы сабраны кнігі мемуарнага характару, нарысы, мастацкія творы.

Першы аддзел выстаўкі «З партыяй на чале» адкрываецца работамі У. І. Леніна аб абароне сацыялістычнай Айчыны. Тут прадстаўлена літаратура, якая паказвае ролю Камуністычнай партыі ў справе ўмацавання магутнасці нашай Радзімы і вызвалення Беларусі ад гітлераўцаў: «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі»; П. П. Ліпіла «КПБ—арганізатар і кіраўнік партызанскага руху ў Беларусі»; «Аб партыйным падполлі ў Мінску ў гады Вялікай Айчыннай вайны» і іншыя. Прыведзены словы В. І. Казлова аб выхаванні Камуністычнай партыяй «людзей асобага складу», якія самааддана змагаліся на фронце і ў тыле ў імя незалежнасці нашай Радзімы.

Пад агульным загалоўкам «Крэпасць-герой» змешчана літаратура з маляўнічымі ілюстрацыямі аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці ў першыя дні вайны. Кнігі, прысвечаныя тэме разгрому ворага ў Беларусі, сабраны ў раздзелах «Палкі ідуць на захад». Багата прадстаўлен раздзел «Вайна ў тыле ворага», які расказвае аб Беларусі партызанскай. У ім найбольшая колькасць кніг. Сярод іх: «Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны»; П. З. Калінін «Партызанская рэспубліка»; В. І. Казлоў «Людзі асобага складу» і іншыя.

Кнігі аб дзейнасці беларускага падполля экспануюцца ў аддзеле «Фронт без акопаў».

Аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі расказваюць ілюстраваныя кнігі, сабраныя пад загалоўкам «Не забудзем, не даруем». Сярод іх і часопісны артыкул «Мы не забудзем цябе, Хатынь!»

Дасягненню Беларусі ў галіне прамысловасці, народнай адукацыі і культуры прысвечан самастойны стэнд, азаглаўлены «Квітней, мая Беларусь».

Наведаўшы гэтую выстаўку, чытач пазнаёміцца з асноўнай літаратурай, якая маецца ў бібліятэцы па тэме вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Л. ПЯЛЕВІНА,
ст. бібліятэкар.

І ЛІДЭРЫ ХВАЛЮЮЦЦА

Пераможца спаборніцтва акадэмічных груп за лепшую паспяховасць — трэці курс філасофскага аддзялення—у мінулы панядзелак здаваў экзамен па гісторыі філасофіі народаў СССР. Хваляванняў было многа; гэты прадмет патрабуе ведання вялікага матэрыялу, а дапаможнікаў па многіх пытаннях курса мала. Даводзілася карыстацца кнігамі, у якіх толькі па кроплях асветлены тыя ці іншыя праблемы. Канешне, многа дапамаглі канспекты лекцый, а іх вялі ўсе студэнты.

Вынікі экзамена паказалі, што ўсе трэцякурснікі, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, добра засвоілі праграмны матэрыял. З 25 чалавек 12 атрымалі выдатныя адзнакі, астатнія—добрыя. Хочацца назваць сярод лепшых Т. Адула, М. Вінніка ва, Ю. Шынкара, О. Ігнаценка, Т. Міронаву, У. Кузьмінова, А. Байчарова, Н. Беляковіч, Г. Санюк. Студэнты-філосафы трэцяга курса яшчэ раз пацвердзілі, што тытул мацнейшых ім прысвоен нездарма.

На здымку **М. Нечыпарэнкі**—экзамен прымае старшы выкладчык М. Р. Галенка з асістэнтам—аспірантам С. Д. Шашам.

ЗДАЮЦЬ ВЯЧЭРНІКІ

Вось і настала летняя экзаменацыйная сесія. Здаюць яе і вячэрнікі — рабочыя і служачыя, тэхнікі і настаўнікі, піянерважатыя і адміністрацыйныя работнікі, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю. Ні для кога не сакрэт, што яны маюць значна менш часу, чым студэнты, якія вучацца ўдзень. Аднак гісторыкі пятага курса па сваіх ведах не адрозніваюцца ад студэнтаў дзённай формы навучання: здаюць прадметы па той жа праграме, ды і адзнакі маюць не горшыя — увогуле, курс моцны. Гэта і адзначыў выкладчык музеязнаўства кандыдат гістарычных навук В. Н. Рабцэвіч. Ён падкрэсліў, што задаволен і практычнымі работамі студэнтаў, і іх вуснымі адказамі, нягледзячы на тое, што музеязнаўства — навука маладая і нават не мае стабільнага падручніка.

Усе студэнты паказалі добрыя веды, на ўсім курсе не было ніводнай нездавальняючай адзнакі. Асабліва добра адказвалі рабочыя трактарнага завода П. Мястоўскі і М. Працько, старшы інспектар па кадрах падшыпнікавага завода В. Прэабражэнскі, выкладчыца музыкі Д. Гафіятуліна, будаўніца В. Курлянчык і шмат іншых.

М. ВЯРШЫНІН,
студэнт пятага курса

ВЯЛІКАМУ ЮБІЛЕЮ—ДАСТОЙНЫЯ ПАДАРУНКІ



УПЕРАДЗЕ—ЛЕНІНСКІ ПРАЦОЎНЫ

Пройдуць лічаныя дні— і перон Мінскага вакзала расквітнее ад шчаслівых усмешак. Першыя пасланцы, студэнты будаўнічых атрадаў універсітэта, адправяцца ў неабжытыя, поўныя рамантыкі і прыгод куткі краіны. Адных чакае непаўторная прыгажосць казахстанскага стэпу, іншых —маляўнічы горад на Волзе — Тальяці, трэція будуць захапляцца цудоўным казачным дываном беларускіх лясоў, чацвёртыя пазнаёмяцца з каштоўнымі вартасцямі ГДР, Малдавіі, Эстоніі, Крыма, Каўказа.

Агульны паток студэнтаў нашага універсітэта, якія прымуць удзел у працоўным семестры-69, складзе больш 1.900 чалавек. Прыемна, што першакурснікі— піянеры студэнцкай будоўлі — складаюць крыху больш палавіны ад агульнай колькасці ўдзельнікаў працоўнага семестра. Гэта добры факт. Як відаць з вопыту папярэдніх гадоў, толькі той атрад вяртаецца з лаўрамі перамогі, у якім была праведзена грунтоўная падрыхтоўчая работа.

Цяпер ва універсітэце фарміруецца 55 атрадаў. На І чэрвеня гатовы да адпраўкі толькі цалінныя атрады. У астатніх атрадах яшчэ наперадзе значная падрыхтоўчая работа. Па-першае, пагражальнае становішча склалася ў беларускіх атрадах — з 700 чалавек толькі 470 зрабілі прывіўкі. Тых, хто не пройдзе поўнага медыцынскага агляду, мы будзем вымушаны выключыць з атрадаў. Па-другое, не ва ўсіх атрадах праведзены сходы з абмеркаваннем будучых працоўных спраў, не зроблен залік па статуту студэнцкага будаўнічага атрада. Мы ўжо ведаем сумныя факты з гісторыі студэнцкай цаліны, якія з'явіліся вынікам такой «падрыхтоўкі» да працоўнага семестра, неарганізаванасці.

Гэтае пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні камітэта камсамола. Было выказана многа дзелавых прапаноў. Памылкова было б лічыць, што такое становішча — віна факультэцкіх камітэтаў камсамола і штабаў працоўных спраў. Прычыны значна глыбейшыя. Уся бяда ў тым, што мы рыхтуемся да студэнцкага лета за 2—3 месяцы да канікул, «штурмуем», спяшаемся. На наш погляд, можна пазбегнуць такой з'явы. Больш мэтазгодна ўвесці ў практыку пастаянна дзейнічаючыя штабы працоўных спраў, якія на працягу ўсяго года вялі б работу па прыцягненню ў атрады найбольш дысцыплінаваных, зацікаўленых студэнтаў, планамерна накіроўвалі б усю падрыхтоўчую работу да працоўнага семестра. Гэта дазволіць пазбегнуць «фарсіравання», залішняй нервовасці кіраўнікоў атрадаў, медыцынскіх работнікаў, членаў атрадаў. Галоўнае, што такое рашэнне пытання будзе станоўча ўплываць на вынікі сесіі, на якасць работы камітэтаў камсамола, якія змогуць накіроўваць работу на правядзенне справаздачна-выбарнай кампаніі ў групах і на курсах.

І другая праблема, з якой мы штогод сутыкаемся,— гэта праблема падбору камандзіраў. У гэтым годзе на некаторых факультэтах па прычыне вымушаных акалічнасцей камандзірамі назначаны людзі, якія не маюць ніякага вопыту ў будаўнічай справе. А вядома ж: камандзір студэнцкага будаўнічага атрада павінен валодаць не толькі арганізатарскімі здольнасцямі, але і дакладна ўяўляць аб'ём, маштабы будаўніцтва, разбірацца ў тонкасцях вытворчага працэсу. Гэта ўсё прыходзіць з практыкай.

Магчыма, ёсць неабходнасць абавязаць усіх камандзіраў атрадаў падрыхтаваць па аднаму пераемніку для кіраўніцтва ў наступным годзе. І недзе ў верасні месяцы такі камандзір мог бы прыступіць да выканання сваіх абавязкаў, не чакаючы вясны.

Працоўны семестр-69 — асаблівы. Ён праводзіцца напярэдадні ленінскага юбілею, прысвячаецца яму. Вынікі працоўнага семестра— гэта наш падарунак Ільічу, які даваў запавет не толькі вучыцца і глядзець, як расце будынак камунізма, а кожнаму актыўна ўдзельнічаць у жыцці краіны. Камітэт камсамола заклікае ўсіх удзельнікаў працоўнага семестра сур'ёзна падрыхтаваць сябе да вялікай работы сярод мясцовага насельніцтва па прапагандзе ленінскай тэарэтычнай спадчыны, кожнаму камсамольцу быць гатовым арганізаваць для рабочых і калгаснікаў ленінскія чытанні, лекцыі аб жыцці і дзейнасці заснавальніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Мы заклікаем студэнтаў універсітэта актыўна ўключыцца і ў двухгодку «Камсамол — сельскай школе», якую аб'явіў Цэнтральны Камітэт ВЛКСМ.

П. БОНДАР,
нам. сакратара камітэта камсамола універсітэта.

ГІСТОРЫКІ НЕ ПАДВЯДУЦЬ

Набліжаецца к канцу навучальны год. Уперадзе поўнае рамантыкі і вяселля лета. Як жа збіраюцца правесці свае канікулы нашы рабяты!

Сёлета, як і ў мінулыя гады, студэнты факультэта, якія не будуць заняты практыкай, прымуць удзел у працоўным семестры. На факультэце многае зроблена па падрыхтоўцы і фарміраванню студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Камсамольскія сходы, праведзеныя ў групах і на курсах, паказалі, што нашы рабяты гатовы праявіць сябе ў працы. На факультэце сфарміравана некалькі будаўнічых атрадаў. Асаблівая ўвага была ўдзелена атраду, які будзе працаваць на цаліне.

З году ў год нашы цаліннікі займалі першыя месцы, прывозілі пераходныя сцягі. Як жа будзе ў гэтым годзе!

Фарміруючы цалінны атрад, мы сустрэліся з некаторымі цяжкасцямі, якіх магло б і не быць, калі б не была дапушчана памылка ў фарміраванні мінулагодняга атрада. Справа ў тым, што ў мінулым годзе атрад складаўся ў асноўным са старшакурснікаў, а камітэт камсамола факультэта не паклапаціўся аб пераемнасці. Такім чынам, сёння наш цалінны атрад мае ў сваім саставе толькі трох «умудроных вопытам цаліны» рабят. І ўсё ж, нягледзячы на гэта, нашы студэнты на чале з камуністамі В. Наважылавым і Ф. Лазюком поўныя рашучасці працягваць тыя лепшыя традыцыі, якія былі закладзены папярэднікамі.

Укамплектаваны і атрады, якія будуць працаваць на будоўлях горада Мінска і рэспублікі, а таксама ў горадзе Тальяці.

У гэтым годзе пачынаюцца работы па аднаўленню помнікаў старажытнасці. Да студэнтаў нашага факультэта была звернута просьба арганізаваць эксперыментальны рэстаўрацыйны атрад. І такі атрад ужо створан. Ён будзе працаваць у горадзе Мсціслаўлі.

Сёлетні працоўны семестр у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна аб'яўлен ударным. Гэта накладвае яшчэ большыя абавязкі. Таму камітэт камсамола факультэта прапанаваў, а партыйнае бюро адобрыла арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва паміж нашымі атрадамі. Перад студэнцкімі будаўнічымі атрадамі ставіцца задача, якая ўключае не толькі ўдарную працу, але і правільную арганізацыю адпачынку, а таксама вялікую прапагандысцкую работу сярод мясцовага насельніцтва. Ідэалагічным сектарам камітэта камсамола з дапамогай кафедр распрацавана спецыяльная тэматыка лекцый, па тры-чатыры з якіх будуць прачытаны кожным байцом СБА. Такімі лекцыямі будуць забяспечаны і студэнты, якія паедуць на вучэбную і вытворчую практыку.

У абавязкі нашых атрадаў уваходзіць і арганізацыя шэфскіх канцэртаў мастацкай самадзейнасці, таварыскія спартыўныя спаборніцтвы з камандамі бліжэйшых калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў, а таксама наладжванне піянерскіх лагераў-спадарожнікаў. Для таго, каб азнаёміць сакратароў камсамольскіх груп і камісараў атрадаў з шэфскай работай, камітэт камсамола і партбюро факультэта правялі спецыяльны семінар.

Цяпер у асноўным арганізацыйная і падрыхтоўчая работа на факультэце завершана. Нядаўна камітэт камсамола гістфака справаздачу аб падрыхтоўцы да трэцяга працоўнага семестра трымаў перад сходам камуністаў, дзе была пастаўлена адна з важнейшых задач на бліжэйшы перыяд — паспяхова здаць сесію.

Д. РОТМАН, студэнт.

КРЫТЭРЫЙ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ

Ленінскі залік

Цяпер увесь камсамол, уся савецкая моладзь актыўна рыхтуюцца да сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. У гэтай падрыхтоўцы асаблівае значэнне набывае ленінскі залік, які з'яўляецца важным сродкам арганізацыйна-палітычнага ўмацавання пярвічных арганізацый. Ленінскі залік прадугледжвае вывучэнне кожным камсамольцам ленінскай тэарэтычнай спадчыны, важнейшых партыйных дакументаў, павышэнне працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці.

У камсамольскай арганізацыі матэматычнага факультэта абмяркоўвалася праграма ўдзелу ва Усесаюзным ленінскім заліку. Былі праведзены нарады камсамольскага актыву, выпушчан спецыяльны нумар «Інфармацыйнага лістка» пад агульным дэвізам «Рыхтуйся да ленінскага заліку», дзе расказана аб асноўных палажэннях правядзення ленінскага заліку.

Камітэт камсамола факультэта рэкамендаваў вывучыць у камсамольскіх групах такія работы У. І. Леніна, як «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», «Дзяржава і рэвалюцыя», «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме», «Вялікі пачын», «Чарговыя задачы Савецкай улады», артыкулы «Аб кааперацыі», «Аб нашай рэвалюцыі», «Старонкі з дзённіка», «Лепш менш, ды лепш»; цікавай з'яўляецца кніга Е. Д. Стасавай «Успаміны», якая толькі выйшла з друку. Формы вывучэння ленінскай спадчыны могуць быць рознымі. Важнае месца адводзіцца ленінскім урокам.

З лекцыямі па ленінскай тэме студэнты выступяць на прадпрыемствах, у школах. Акрамя таго, рыхтуюцца выступленні па тэмах: «Развіццё матэматыкі ў БССР за 50 год», «Роля матэматыкі ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма». У распрацоўцы гэтых тэм прымалі ўдзел акадэмік Ф. Д. Гахаў і дацэнт А. Н. Нахімоўская.

На факультэце створаны тры лектарскія групы. Камсамольцы па пуцёўках камітэта камсамола выступаюць з гутаркамі аб сваім факультэце, аб універсітэце перад школьнікамі рэспублікі.

Ленінскія ўрокі, выступленні па ленінскай тэматыцы перад працоўнымі—гэта работа не толькі з людзьмі, але і над сабой. Такія ўрокі— гэта глыбокі аналіз ленінскай тэарэтычнай спадчыны, вынікі практычнай дзейнасці кожнага камсамольца.

Выхоўваючы ў сабе ленінскія якасці, параўноўваючы свае паводзіны, сваю дзейнасць з жыццём Уладзіміра Ільіча, кожны малады чалавек павінен крытычна ацаніць, як ён працягвае справу Леніна. Стала адной з традыцый камсамола ва ўсіх важнейшых сваіх пачынаннях раіцца з Леніным.

Ленінскі залік для студэнтаў матэматычнага факультэта, як і для ўсёй савецкай моладзі, пачаўся з камсамольскага суботніка 12 красавіка, у дзень 50-годдзя Вялікага пачыну.

Важным укладам у ленінскі залік з'явіцца працоўны семестр. На факультэце арганізавана 9 студэнцкіх атрадаў, якія будуць працаваць на будоўлях Беларусі, 2 цалінныя атрады, дзяўчаты (50 чалавек) паедуць працаваць у саўгасы Крыма, у піянерскія лагеры, астатнія камсамольцы прыкладуць свае сілы на будоўлях Мінска, у цэхах заводаў.

Вялікай з'яўляецца роля камсамольскай студэнцкай групы. І толькі тады мы зможам сказаць, што сапраўды справы ў нашым вялікім калектыве ідуць добра, калі яны добра пастаўлены ў кожнай камсамольскай групе. А такіх груп на факультэце многа: V група першага курса, дзе камсоргам была К. Суша, IV група гэтага ж курса—камсорг Н. Ігоніна, V група другога курса — камсорг М. Сагайловіч, IV група другога курса—камсорг Т. Верас і іншыя. Актыўная дапамога адзін аднаму ў вучобе і добра пастаўленая палітыка-выхаваўчая работа згуртавалі калектывы гэтых груп. У многіх з іх прайшлі дыспуты, арганізаваныя сумесна з бібліятэкай. Так, напрыклад, у V групе першакурснікаў цікава прайшоў дыспут па кнізе Уладзіслава Ціто-ва «Усім смерцям насупраць». На другім курсе ў IV групе адбылася вельмі важная размова аб ленінскім заліку: студэнтка Л. Ліннік расказала аб рабоце У. І. Леніна «Задачы Саюза моладзі», камсорг Т. Верас—аб ленінскім заліку. Група вызначыла план правядзення ленінскага заліку. Трэцякурснікі з першай групы арганізавалі паездку ў Хатынь. А задоўга да яе азнаёміліся з архіўнымі матэрыяламі, дакументамі, якія расказваюць аб трагедыі гэтай вёскі. Наведалі гэтае памятнае месца і студэнты другога курса.

Цяпер у многіх групах выбран новы камсамольскі актыў, якому даверана, мабыць, самае складанае — кіраваць сваім невялікім калектывам.

Гэты год аб'яўлен ударным, і таму патрэбна паставіць камсамольскую работу так, каб кожны дзень стаў днём праверкі вернасці ідэалам Леніна.

З. ДАМАРАЦКАЯ,
намеснік сакратара камітэта камсамола матэматычнага факультэта па ідэалагічнай рабоце.



Разам з іншымі таленавітымі людзьмі ў аспірантуры БДУ імя У. І. Леніна займаецца нямала прадстаўнікоў брацкіх краін.

27 мая на пасяджэнні вучонага савета універсітэта была абаронена яшчэ адна кандыдацкая дысертацыя. Аўтар яе — выхаванец нашай аспірантуры малады в'етнамскі даследчык Ле Тхань Хоахом. Кіраваў яго работай член-карэспандэнт АН БССР доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Леанід Вікенцьевіч Валадзько.

НА ЗДЫМКУ: Ле Тхань Хоахом.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ

ПРАЦЯГ ТРАДЫЦЫІ

Добрай традыцыяй нашага універсітэта з'яўляецца падрыхтоўка з ліку замежных грамадзян не толькі спецыялістаў высокай кваліфікацыі, але і навуковых работнікаў. Пад кіраўніцтвам вучоных БДУ былі падрыхтаваны і паспяхова абаронены кандыдацкія дысертацыі на біялагічным, філалагічным, матэматычным, фізічным і іншых факультэтах. І цяпер у нашай аспірантуры займаюцца прадстаўнікі раду краін народнай дэмакратыі.

Даследчыкі універсітэта — навуковыя кіраўнікі не парываюць сувязей з замежнымі вучонымі, працягваюць аказваць ім дапамогу, даюць парады, як працаваць далей над выбранымі тэмамі або як весці заняткі па падрыхтаванаму ў час вучобы ў аспірантуры курсу. Іх перапіска выходзіць, безумоўна, за межы асабістых адносін, мае грамадскае значэнне. Вось чаму мы і папрасілі ў акадэміка Фёдара Дзмітравіча Гахава дазволу азнаёміць чытачоў «Беларускага універсітэта» з пісьмом, якое ён атрымаў нядаўна ад свайго вучня з В'етнама Х. Д. Зунга. Х. Д. Зунг займаўся ў нашай аспірантуры, пад кіраўніцтвам Ф. Д. Гахава напісаў кандыдацкую дысертацыю па матэматыцы і ў пачатку гэтага года абараніў яе. ВАК зацвердзіла работу маладога в'етнамскага даследчыка, яму ўжо адпраўлен дыплом кандыдата навук.

Вось што піша ў сваім лісце ў Мінск Х. Д. Зунг:

«Глыбокапаважаны Фёдар Дзмітравіч! Пасля двух месяцаў адпачынку дома я прыехаў у Ханой, каб прыступіць да работы.

Цяпер я знаходжуся далёка ад Мінска, але не забываю пра Вас, аб сваіх цяжкіх першых днях у Савецкім Саюзе. Як Вы жывяце, як Ваша здароўе, здароўе Валянціны Сцяпанаўны? (Жонка Ф. Д. Гахава. — **Рэд**). Які вы чытаеце спецкурс у гэтым семестры? Я чуў, што Вы пішаце новую кнігу, што ўжо зроблена? Якія пытанні цяпер абмяркоўваюцца на Вашым семінары? Як бачыце, я хачу падрабязна ўсё ведаць пра Вас, аб Вашых поспехах.

Цяпер аб сабе. Я добра адпачыў і ўжо прыступіў да працы. Падрыхтаваў спецкурс аб адваротных краявых задачах, чытаю тэорыю функцый многіх комплексных пераменных. Далей я мяркую вывучаць краявыя задачы для гэтых функцый. Вельмі хацелася б атрымаць Вашы парады для работы ў гэтым напрамку.

Жадаю Вам і праз Вас Валянціне Сцяпанаўне моцнага здароўя, шчасця, вялікіх поспехаў у працы.

Гарачае прывітанне Вам ад маіх родных (я расказаў ім падрабязна, як Вы многа дапамаглі мне).

Ваш вучань Х. Д. Зунг».

Наўрад ці патрэбны каментарыі да гэтага пісьма. Заўважым толькі, што Х. Д. Зунг закончыў Ханойскі універсітэт, працаваў у адным з тэхнічных інстытутаў ДРВ, а пасля быў накіраван у аспірантуру ў Мінск. Першыя дні знаходжання ў Савецкім Саюзе, як ён піша, сапраўды былі цяжкімі: Х. Д. Зунг не ведаў рускай мовы. Але хутка з дапамогай свайго новага кіраўніка, новых шматлікіх універсітэцкіх сяброў гэтая цяжкасць была пераадолена. В'етнамскі матэматык цяпер з поспехам змог бы выкладаць на сваёй радзіме і рускую мову. Малады вучоны працуе цяпер у Ханойскім універсітэце.

І апошняе. Фёдар Дзмітравіч у сваім адказе падзякаваў свайму вучню за памяць аб Беларусі, універсітэце, павіншаваў з пачаткам работы і склаў для Х. Д. Зунга падрабязную праграму далейшых яго даследаванняў. Беларускі акадэмік працягвае навуковае кіраўніцтва работай свайго в'етнамскага вучня.

У. БЛАКІТНЫ.

У адзінай сям'і студэнтаў універсітэта нямала моладзі з краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

НА ЗДЫМКУ: прадстаўнікі з Сірыі і Самалі шчыра, па-сяброўску гутараць з нашымі студэнтамі на вечары інтэрнацыянальнай дружбы.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

СУСТРЭЧЫ НАД БУГАМ

З усіх куткоў Савецкага Саюза, з многіх краін свету прыязджаюць людзі ў Брэст, каб сваімі вачамі ўбачыць гераічную цытадэль над Бугам, каб нізка пакланіцца памяці загінуўшых герояў. Легенды, вершы і песні складае савецкі народ аб слаўных абаронцах пагранічнай крэпасці.

Нядаўна пабывалі тут і студэнты падрыхтоўчага факультэта.

Нам спадабаўся Брэст — старажытны невялікі горад, які адзначыў свой 950-гадовы юбілей. Яшчэ ў В'етнаме мы чулі аб ім, чыталі з цікавасцю і захапленнем пра абаронцаў крэпасці.

Нельга забыць тых, хто змагаўся супраць фашыстаў да апошняй кроплі крыві. Яны жывуць і будуць жыць у памяці і ў сэрцах кожнага сумленнага чалавека.

И пусть, чередою
сменяя друг друга,
Бегут и года и века
над землей —
Для всех поколений
крепость над Бугом
Останется вечно
живой.

Так, мы былі на брэсцкай зямлі, дзе 28 гадоў назад грымелі жорсткія баі. Я хадзіў па вуліцах горада, быў у крэпасці, бачыў Буг і Мухавец. Рэкі зараз спакойна і велічна нясуць свае чыстыя воды. Але, як мне сказалі, вада была чырвонай ад крыві, калі тут ішлі баі з ворагам. Я спускаўся ў катакомбы крэпасці, дзе мужныя абаронцы без ежы і вады больш месяца да апошняга патрона абаранялі цытадэль. На сценах крэпасці захаваліся такія надпісы: «Я умираю, но не сдаюсь. Прощай, Родина!».

Верныя сыны Камуністычнай партыі змагаліся у першых радах, паказваючы прыклад мужнасці і адвагі.

Тут, на свяшчэннай зямлі, мы сустрэліся з жывымі сведкамі падзей, удзельнікамі абароны А. А. Аршынавай, Я. І. Каламійцам, Т. П. Дамброўскім, якія расказалі многа цікавых фактаў, вадзілі нас па месцах баёў.

У кінозале музея абароны нам паказалі дакументальны фільм аб цытадэлі над Бугам. Пасля мы ўсклалі вянок з жывых кветак да Вечнага агню, дзе будзе ўстаноўлен у хуткім часе помнік.

За час падарожжа па гораду мы наведалі таксама краязнаўчы музей і гарадскі парк культуры і адпачынку. А вечарам у Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце адбыўся вечар савецка-в'етнамскай дружбы. Надзвычай цёпла вітала нас моладзь.

На другі дзень мы наведалі музей А. В. Суворава ў горадзе Кобрыне. Калі ад'язджалі, шкада было развітацца з Брэстам, з яго гасціннымі і ветлівымі людзьмі. За гэты час мы паспелі прывыкнуць да горада, пасябраваць з яго жыхарамі.

ВУ ДАЙ КУАНГ,
студэнт падрыхтоўчага факультэта.

НАШ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ КЛУБ

● Дысертацыю абараняе аспірант з В'етнама ● Пісьмо беларускаму акадэміку ● Подзвіг савецкіх людзей хвалюе ● Мамед Алі — матэматык і паэт

Мамед Алі любіць не толькі матэматыку, але захапляецца і паэзіяй, сам піша вершы. Добрым дарадчыкам яму з'яўляецца выкладчык рускай мовы М. В. Елісеева.

НА ЗДЫМКУ: М. В. Елісеева і яе вучань з Лівана ў час кансультацыі.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ДА РУСКАЙ МОВЫ

У маладых краінах Азіі і Афрыкі, як і ва ўсім свеце, расце зацікаўленасць да рускай мовы.

У сталіцы Марока Рабаце пры бібліятэцы савецкага пасольства многа год працуюць курсы рускай мовы, якія наведваюць мараканскія студэнты, школьнікі, прадстаўнікі інтэлігенцыі.

Нядаўна на курсах адбылося ўжо стаўшае традыцыйным урачыстае ўручэнне дыпломаў і памятных падарункаў слухачам, якія паспяхова закончылі вучобу. Пасля ўрачыстай часткі ў прасторнай зале бібліятэкі быў наладжан канцэрт самадзейнасці, падрыхтаваны выпускнікамі курсаў. На рускай мове гучалі песні, вершы Пушкіна, Лермантава, Маякоўскага. Найбольшае захапленне ў бацькоў, дзяцей і знаёмых выпускнікоў, якія прысутнічалі ў зале, выклікала маляўнічае выкананне рускага народнага танца «барыня».

Ён стварыў ЦУД

Не верыцца, што ўжо няма ў жывых Антона Канстанцінавіча Цітка. Не верыцца таму, што, калі зойдзеш у біялагічны корпус, на кожным кроку сустракаеш сляды яго працы.

Так, прыкметны след у жыцці універсітэта пакінуў гэты ў вышэйшай ступені сціплы чалавек. У 1925 годзе Антон Канстанцінавіч прыйшоў ва універсітэт. За плячыма — дарогі грамадзянскай вайны, вялікая школа барацьбы за прыгожае жыццё. Яго непасрэднымі настаўнікамі былі Ян Фабрыцыус і іншыя легендарныя палкаводцы маладой Краіны Саветаў — сапраўдныя майстры, кавалі чалавечага шчасця. Можа таму Антон Канстанцінавіч, прыроджаны ваенны, як аб ім гаварылі камандзіры, хутка знайшоў сябе ў мірнай стваральнай працы. Праўда, і тут знайшліся добрыя настаўнікі, а сярод іх вядомы прэпаратар-таксідэрміст М. А. Колін.

Кажуць, у таленавітага вучня заўсёды таленавітыя настаўнікі. Гэтыя словы поўнасцю адносяцца і да Антона Канстанцінавіча. У 1925 годзе ён пачаў працаваць лабарантам, а праз некалькі месяцаў яму даручылі складаную справу прэпаратара — спецыяльнасць не такая ўжо распаўсюджаная і сёння, а тады і зусім рэдкая. Універсітэту патрэбен быў заалагічны музей. За яго стварэнне і ўзяўся малады супрацоўнік. Пад кіраўніцтвам выдатных біёлагаў, якія па закліку Савецкага ўрада прыехалі працаваць у Беларусь, ён хутка авалодвае сакрэтамі прафесіі. Чучалы птушак, звяроў, якія выходзяць з рук Антона Канстанцінавіча, вабяць сваёй непаўторнасцю. Малады прэпаратар імкнецца прадставіць прыроду роднага краю такой, якая ёсць яна на самай справе — прыгожай, велічнай, жыватворнай. Любімая справа адбірае ўвесь вольны час, хутка і асабістая кватэра ператвараецца ў лабараторыю, цудоўную майстэрню харства.

У Антона Канстанцінавіча паяўляюцца свае вучні — студэнты. Разам з імі А. К. Ціток кожнае лета адпраўляецца ў падарожжы, кожнае ўзбагачае музей, аб якім ужо па ўсёй Беларусі пайшла добрая слава.

Гутарка ідзе аб заалагічным музеі універсітэта. Сапраўды, наш музей з яго сотнямі і тысячамі экспанатаў, музей, які штогод наведваюць дзесяці тысяч чалавек, якім захапляюцца самыя патрабавальныя спецыялісты, па сутнасці гэта вынік працы Антона Канстанцінавіча. І трэба мець вялікую душу, каб бачыць глыбей і далей, больш, чым іншыя, бязмежна любіць сваю справу, свой родны край, каб стварыць такі цуд.

Ды справа і не толькі ў гэтым. А. К. Ціток за сорак год працы ва універсітэце стварыў вялікую беларускую школу прэпаратараў - таксідэрмістаў, тысячы юнакоў і дзяўчат прайшлі практыку ў Антона Канстанцінавіча. Ды якую практыку! Не выпадкова потым многія з іх самі ў школах, інстытутах стварылі свае заалагічныя музеі, куткі прыроды. Цяпер яны самі вучаць маладое пакаленне любіць родны край, беражліва адносіцца да таго, што дае нам маці-прырода.

Да глыбокай старасці Антон Канстанцінавіч не мог пакінуць любімую справу. Але, калі нават пайшоў на пенсію, будучы цяжка хворым, ён клапаціўся аб сваім дзецішчы, прыходзіў ва універсітэт, дапамагаў захоўваць экспанаты, ствараць новыя, вучыў моладзь. Ён і памёр са словамі «Як там музей?..»

Не, не верыцца, што Антона Канстанцінавіча няма сярод нас. Доўга-доўга памяць аб ім будзе жыць ва універсітэце, ва ўсёй Беларусі, бо жыве і пашыраецца яго справа, бо ўзнятую ім у 1925 годзе эстафету нясуць ужо тысячы аматараў роднай прыроды.

М. РЭГІСТАНАЎ.

МАГУТНЫ І ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ

Да 70-годдзя з дня нараджэння

Л. М. Ляонава

Сваімі поспехамі і дасягненнямі савецкая літаратура ў многім абавязана тым пісьменнікам, якія садзейнічалі яе станаўленню, закладвалі першыя цагліны ў яе падмурак.

Леанід Максімавіч Ляонаў належыць да іх ліку. Плённы і самабытны мастак, выдатны майстар славеснага жывапісу, захавальнік рускага моўнага багацця, ён прысвяціў літаратурнай працы каля 50 год жыцця.

Прызванне да літаратурнай дзейнасці праявілася ў Л. Ляонава ўжо ў шаснаццацігадовым узросце, аднак нараджэнне яго як пісьменніка звязана з рэвалюцыяй і грамадзянскай вайной. У суровай і жорсткай барацьбе фарміраваўся светапогляд пісьменніка, мужнеў і мацнеў паэтычны голас.

Успамінаючы гэты перыяд «магутнага клублення сіл», Л. Ляонаў пісаў: «Гэта была пара гневу і найбольшай матэрыяльнай беднасці, але мы былі багацей усіх: неразменныя чырвонцы юнацтва звінелі ў нашых песнях».

Было б памылкова гаварыць аб прамым і лёгкім далучэнні пісьменніка да рэвалюцыйнага мастацтва. Перад гэтым былі пошукі і знаходкі, промахі і няўдачы, страснае жаданне тварыць і адсутнасць вопыту літаратурнай работы. Вось чаму апавяданні «Бурыга», «Пятушыхінскі пралом», «Гібель Ягоркі» насілі пячаць вучнёўства і не вызначаліся ідэйнай акрэсленасцю пазіцыі аўтара.

Пакутлівы і складаны працэс пошукаў «сваёй песні» ў літаратуры працягваўся ў Л. Ляонава параўнальна нядоўга. Творчай удачай мастака з'явіўся яго раман «Барсукі» (1924), які атрымаў заслужаную высокую ацэнку А. М. Горкага і А. В. Луначарскага. Востры сацыяльныя канфлікты ў асяроддзі сялянства, сцверджанне непазбежнай гібелі старога свету, перамога бальшавіцкай праўды ў вёсцы—усё гэта адлюстравана Л. Ляонавым адчувальна, бачна, хоць і не заўсёды роўна. «Гэта кніга — надоўга», — ахарактарызаваў раман А. М. Горкі. Жыццё пацвердзіла праўдзівасць гэтых слоў.

Шырокі размах індустрыяльнага будаўніцтва, незвычайны гераізм рабочых мас быў увасоблен Л. Ляонавым у рамане «Соць» (1930), які быў напісан на матэрыяле будаўніцтва цэлюлозна-папяровага камбіната. Савецкая рэчаіснасць стварыла і згуртавала рабочы калектыў будоўлі — «новыя... людскія парасткі», «згуртаваны атрад, гатовы да любога бою». Дзікі, не крануты цывілізацыяй край, які даваў прытулак драпежнаму зверу ды манахам з манастырскіх скітаў, быў разбуджан для новага жыцця, напоўніўся магутным людскім гулам будаўніцтва.

На чале сілы, якая пераўтварае гэты мядзвежы вугал,—бальшавікі Пацёмкін і Увадзьеў, поўныя жалезнай волі, настойлівасці і ўпорства.

А. М. Горкі, які пільна сачыў за літаратурнай дзейнасцю Л. Ляонава, назваў раман «цудоўнай рэччу, напісанай смачнейшай, моцнай, яснай рускай мовай». Поспех рамана «Барсукі» быў не выпадковым, аўтар даказаў гэта сваёй «Соццю». Гэта давала А. М. Горкаму права заявіць: «Ён, Ляонаў, вельмі таленавіты, таленавіты на ўсё жыццё і — для вялікіх спраў».

Год ад году ўсё ярчэй праяўляліся шчодрыя грані таленту Л. Ляонава. Раманы «Скутараўскі» (1932), «Дарога на Акіян» (1936) асвятлялі новыя этапы ў жыцці краіны, давалі спажыву для глыбокага роздуму аб яе будучыні. Пісьменнік уважліва ўзіраўся ў жыццё, даследуючы факты рэчаіснасці, падвяргаючы іх клапатліваму адбору.

Ужо ў гэты перыяд складваецца ў Ляонава цяга да шырокіх філасофскіх абагульненняў.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны Л. Ляонаў у поўны голас заявіў аб непераможнасці савецкага народа, аб яго маральнай перавазе над фашысцкімі заваёўнікамі. Пераканаўчы прыклад гэтаму — п'еса «Нашэсце» (1943).

Важнейшай вехай у творчасці Л. Ляонава з'яўляецца яго раман «Рускі лес» (1953)—адзін з найбольш выдатных твораў у пасляваеннай савецкай літаратуры, першы ў савецкай прозе твор, адзначаны высокай узнагародай — Ленінскай прэміяй.

Захапляе эпічны размах апавядання, глыбіня пранікнення ў лёс і псіхалогію герояў, энцыклапедычнасць у трактоўцы і асвятленні ўзнятых пытанняў, цудоўная ляонаўская мова. Вялікая і цудоўная Радзіма, яе бязмежныя прасторы і невычарпальныя багацці ўвасабляюцца ў вобразе рускага леса, даўняга захавальніка і абаронцы Расіі, сімвале сілы і вечнасці.

«Рускі лес—гэта не толькі гімн жыватворнай прыродзе, але і страснае слова ў яе абарону. Гэта не толькі сцверджанне разумнага, добрага, вечнага, але і жорсткае выкрыццё ганебнага, злога, подлага. Гэта — роздум аб грамадзянскай адказнасці кожнага перад іншым, аб унутранай прыгажосці чалавека, аб узаемасувязях навукі і жыцця.

Раман «Рускі лес» вытрымаў 23 выданні агульным тыражом 1.927 тысяч экземпляраў.

Можна без перавелічэння сказаць, што, стварыўшы гэтую кнігу, Ляонаў здзейсніў высокі грамадзянскі подзвіг.

31 мая 1969 года Леаніду Максімавічу споўнілася 70 год. Пісьменнік сустрэў сваё сямідзесяцігоддзе ў поўным росквіце творчых сіл. Удзячныя чытачы чакаюць новых сустрэч з магутнымі праяўленнямі акіяна ляонаўскай думкі.

Б. НІКАНОВІЧ,
аспірант кафедры рускай савецкай літаратуры.

СПОРТ

ПОСПЕХІ РАДУЮЦЬ

У канцы мая на Маскоўскай шашы мераліся сіламі мацнейшыя веласіпедысты беларускага студэнцкага таварыства «Буравеснік». Асноўная барацьба была паміж спартсменамі ІФК, БПІ, РТІ і Гомельскага універсітэта.

Пасля чатырохдзённай барацьбы месцы размеркаваліся наступным чынам: I — ІФК (186 ачкоў), II — БДУ (176), III — БПІ (109). Затым ідуць РТІ, Гомельскі універсітэт, БТІ.

На пытанне «Ці задаволены вы поспехам сваіх выхаванцаў?» трэнер каманды веласіпедыстаў, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Р. І. Васілеўскі адказаў:

— Гэта несумненны поспех нашай каманды. Было б у нашых рабят больш часу для трэніровак, маглі б выйграць у каманды інстытута фізкультуры. Асабліва значны ўклад зрабілі нашы дзяўчаты — кандыдат у майстры спорту Таня Пагрaбенка, майстар спорту Оля Крывадубская (3 курс матфака). Хочацца выдзеліць студэнтак першага курса Зою Кароткую і Тамару Жуковіч (фізфак). Нягледзячы на маладосць і невялікі вопыт, яны праявілі сапраўдную мужнасць і самаадданасць і паказалі на спаборніцтвах высокія вынікі.

Вялікі ўклад у поспехі нашай каманды ўнёс таксама майстар спорту Барыс Сабанееў (IV курс гістфака). У індывідуальнай гонцы на 25 кіламетраў ён заняў другое месца, прайграўшы 2 секунды пераможцу Віталю Назарэнку (БПІ), які за тыдзень да гэтых спаборніцтваў у Харкаве атрымаў перамогу ў матчы алімпійскіх каманд.

В. ЯКАНЕН.

ПАЕЗДКА ДА СЯБРОЎ

Днямі група студэнтаў філалагічнага факультэта на чале з дэканам дацэнтам А. А. Волкам вярнулася з паездкі ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку. Будучыя моваведы і літаратары былі на кароткатэрміновай практыцы ў Іенскім універсітэце імя Ф. Шылера. З гэтым універсітэтам у нас даўно ўсталяваліся цесныя сувязі ў галіне навуковых даследаванняў, у вучэбнай рабоце. Штогод універсітэты-пабрацімы абменьваюцца дэлегацыямі вучоных і студэнтаў, дзеляцца сваім вопытам.

МОЙ РОДНЫ КУТ,
ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ...

Фота **С. Супруна**.

Студэнтка першага курса філалагічнага факультэта Святлана ТАТУР — пераможца агляду мастацкай самадзейнасці факультэтаў.

НА ЗДЫМКУ: С. ТАТУР з уручаным ёй падарункам.
Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

Кнігі твайго выкладчыка, студэнт

У ГЛЫБІНЮ СТАГОДДЗЯЎ

Перыяд беларускай старажытнай літаратуры ахоплівае восем стагоддзяў (З XI па XVIII уключна). Па часе гэта самы большы перыяд, цэлая эпоха ў развіцці літаратуры нашага народа. Вывучэнне каштоўнасцей мастацкага слова, створаных у гэты час, — задача пачэсная і адказная, таму ўсё новае, што на гэту тэму паяўляецца на кніжным рынку, зацікаўлены чытач прымае заўсёды з удзячнасцю, як важную падзею ў справе даследавання і папулярызацыі культурнай спадчыны мінулага. Вось чаму з задавальненнем прымаем мы і новую працу па гісторыі старажытнай беларускай літаратуры, напісаную прафесарамі П. П. Ахрыменкам і М. Р. Ларчанкам[1].

Кніга задумана аўтарамі як спроба (дарэчы, першая і ўдалая) стварыць вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ па курсу старажытнай беларускай літаратуры. Але яна прынясе карысць і настаўнікам сярэдніх школ, і аспірантам, і самым шырокім колам чытачоў.

Нельга не адзначыць, што ва ўсіх раздзелах кнігі яе аўтары выступаюць не толькі з абагульненнем навуковага матэрыялу ў межах праграмы філалагічных факультэтаў ВНУ, але і як новыя даследчыкі ўсіх важнейшых праблем гісторыі старажытнай літаратуры.

Пачынаецца кніга «Уводзінамі», у якіх асветлены важнейшыя агульныя пытанні, вырашыць якія неабходна, пачынаючы курс старажытнай беларускай літаратуры, — аб яе ўзнікненні, аб грамадскім значэнні для свайго часу, аб яе значэнні ў наш час, аб яе спецыфічных жанравых, стылёвых асаблівасцях, гістарычным лёсе, перыядызацыі.

Асноўныя раздзелы адпавядаюць важнейшым перыядам у развіцці беларускай літаратуры ў старажытную эпоху. Перыядызацыя, якою карыстаюцца аўтары, прынцыпова не адрозніваецца ад прынятай сучасным літаратуразнаўствам.

Першы перыяд усіх літаратур братніх усходнеславянскіх народаў — рускага, беларускага і украінскага— літаратура эпохі Кіеўскай Русі — падаецца ў плане агляду. Даўшы агульную ацэнку прыгожаму пісьменству гэтага часу, аўтары спыняюцца толькі на важнейшых з'явах агульнарускай літаратуры, аддаючы перавагу тым, якія ўзніклі на тэрыторыі пазнейшай Беларусі або маюць якоесьці іншае дачыненне да яе. Такі падыход да асвятлення гісторыі літаратуры часоў Кіеўскай Русі нам здаецца правільным, асабліва калі ўлічыць, што аўтары ставілі перад сабой задачу стварыць дапаможнік для студэнтаў, якія вывучаюць гэты агульнарускі перыяд і ў курсе старажытнай рускай літаратуры; усе яе з'явы з дастатковай паўнатой і падрабязнасцю асветлены ў падручніках.

У адпаведнасці з сучаснай гістарычнай канцэпцыяй у кнізе асвятляецца працэс фарміравання беларускай народнасці, пытанне ўзнікнення пісьменнасці. Упершыню ў вучэбнай кнізе па старажытнай беларускай літаратуры падрабязна разглядаюцца творы аб дзеячах старажытнай культуры, якія жылі і тварылі на тэрыторыі пазнейшай Беларусі або блізкай да яе (Еўфрасінні Полацкай, Меркурыі Смаленскім, Ігнацыі Смаляніне).

Цэнтральнае месца ў кнізе прафесараў П. П. Ахрыменкі і М. Р. Ларчанкі займае разгляд літаратуры XVI і XVII стагоддзяў — дзейнасць Ф. Скарыны, В. Цяпінскага, С. Буднага, палемічныя творы, мемуарная проза, палітычная сатыра, вершы. Аўтары названага раздзела пераканаўча даводзяць, што ў XVI і XVII стагоддзях у Беларусі былі значна пашыраны гуманістычныя ідэі, якія зрабілі свой дабратворны ўплыў на развіццё грамадскай думкі і літаратуры. Асабліва адносіцца гэта да кнігадрукарскай дзейнасці Ф. Скарыны і яго асветніцкіх ідэй, выказаных у прадмовах і пасляслоўях да надрукаваных ім кніг.

З кнігі мы бачым, што ў XVII стагоддзі (і яшчэ раней — у другой палове XVI) перад пісьменнікамі і наогул перад людзьмі, якія валодалі пяром, стаяла важная нацыянальная задача — страсным публіцыстычным словам весці барацьбу супраць акаталічвання і паланізацыі беларускай народнасці. Аўтар адпаведнага раздзела пераканаўча паказвае, што антыкаталіцкая рэлігійна-палемічная беларуская літаратура XVI і XVII стагоддзяў уяўляла з сябе спецыфічны для Беларусі і Украіны жанр, важны і надзённы для свайго часу ў грамадска-палітычных адносінах. Апрача таго, хоць аснову палемічнай літаратуры гэтага часу складалі багаслоўскія пытанні, у яе лепшых узорах адлюстроўвалася жыццё. Гэтая літаратура была моцна адчувальнай апазіцыяй феадальна-каталіцкай рэакцыі; адначасова ў многіх яе узорах пульсавала думка аб адзінстве рускай і беларускай народнасцей, выяўлялася самасвядомасць, уласцівая нашым продкам.

Поўна і дастаткова падрабязна размежавана ў кнізе літаратура XVIII стагоддзя. Тут асвятляюцца ўзоры бурлескна-сатырычнай прозы, драматургія. Нельга не адзначыць задавальнення тым, што аўтары вылучылі ў спецыяльны раздзел агляд перакладной старажытнай літаратуры Беларусі ўсіх перыядаў. Такое вылучэнне трэба прызнаць рацыянальным, асабліва калі ўлічыць, што галоўнае прызначэнне кнігі — быць вучэбным дапаможнікам студэнтаў.

Студэнты-філолагі атрымалі добры вучэбны дапаможнік па адной з прафілірующых дысцыплін, напісаны з пазіцый сучаснага навуковага літаратуразнаўства.

Л. ЦАРАНКОЎ,
старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры.

[1] П. П. Ахрыменка, М. Р. Ларчанка. Старажытная беларуская літаратура. Выдавецтва «Вышэйшая школа», Мінск, 1968.

Калектыў юрыдычнага факультэта з глыбокім жалем паведамляе, што 3 чэрвеня пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр выкладчык кафедры тэорыі дзяржавы і права Іван Сцяпанавіч БУЧУРЫН, і выказвае спачуванне родным і блізкім памёршага.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 00287 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, карпусы № 1 і 4. Т. 33-07-19. Друкарня выдавецтва «Беларусь», Мінск, Ленінскі праспект, 79.